**Міхась ЦУБА**

***

Пакуль агеньчык шчырасці не знік,
На вобраз твой мне без канца маліцца,
У душы маёй і ў сэрцы сакавік,
Вясна зімою прадаўжае сніцца.

Няхай у двары мяцеліца мяце,
І дрыжыкі кідаюць цела ў холад,
У вачах маіх зноў красавік цвіце,
І губ тваіх я адчуваю солад.

Пушысты снег аблепвае мне твар
Вярнуць у рэальнасць лютаўскую хоча,
А ў галаве кахання дзіўны жар,
І травень палкім голасам шапоча.

У маіх пачуццях доўжыцца падман,
Гартае зноў вясновыя старонкі
І бачу я твой вытанчаны стан,
А побач снег – бялюсенькі і крохкі.